Muzeum Historii Żydów Polskich POLIN

# Рэгламент мерапрыемства Ханука з маленькім Маерам – сямейны фінісаж часовай выставы (далей: "Рэгламент")

1. Мерапрыемства носіць адукацыйна-артыстычны характар.

2. Мерапрыемства праводзіцца 15 снежня 2024 года з 15:00 да 18:00. Арганізатарам мерапрыемства з'яўляецца Музей гісторыі польскіх яўрэяў POLIN, вул. Анелевіча 6, 00-157 Варшава, тэл. 22 471 03 01, www.polin.pl; электронная пошта: polin@polin.pl

3. Каб узяць удзел у мерапрыемстве, небаходна азнаёміцца з наступным Рэгламентам і прытрымліваецца яго палажэнняў. Невыкананне ніжэйпрыведзеных правілаў можа прывесці да выкліку адпаведных службаў парадку для выдалення ўдзельніка мерапрыемства або прыняцця іншых мер, накіраваных на тое, каб спыніць парушэнне Рэгламенту.

4. Уваход на тэрыторыю, дзе праводзіцца мерапрыемства, раўнасільны прыняццю Рэгламенту. Прыняцце Рэгламенту неабходна для ўдзелу ў мерапрыемстве.

5. Мерапрыемства з'яўляецца адкрытым і бясплатным. Непаўналетнія асобы могуць прымаць удзел у мерапрыемстве толькі ў прысутнасці паўналетняга апекуна, які адначасова нясе адказнасць за шкоду і няшчасныя выпадкі, нанесеныя ім самім, а таксама непаўналетнімі асобамі, якія знаходзяцца пад яго апекай.

6. Мерапрыемства складаецца з наступных актыўнасцяў (далей: "мерапрыемствы"): сямейная гульня, анімацыя ў Месцы сямейнай адукацыі, шпацыр па часовай выставе з гідам, ханукальная фотабудка, наведванне пастаяннай або часовай выставы з аўдыягідам.

7. Знаходжанне на тэрыторыі мерапрыемства асоб, якія знаходзяцца пад уздзеяннем алкаголю, наркатычных сродкаў або іншых аналагічных рэчываў, забаронена. Таксама забараняецца ўжыванне алкагольных напояў, ужыванне наркатычных сродкаў або іншых аналагічных рэчываў на тэрыторыі правядзення мерапрыемства.

8. На тэрыторыі правядзення мерапрыемстваў строга забараняецца паліць тытунь, уносіць любыя небяспечныя матэрыялы або прадметы, у прыватнасці зброю, петарды, бенгальскія агні, фальшфееры, феерверкі, нажы, а таксама выкарыстоўваць адкрыты агонь.

9. На тэрыторыі мерапрыемства забараняецца пакідаць смецце, рэшткі ежы і напояў у месцах, не прызначаных для гэтага.

10. Паведамляем, што падчас мерапрыемства будуць зробленыя фатаграфіі і запісаныя відэа, якія будуць апублікаваныя ў сацыяльных сетках Музея (у тым ліку Facebook, Instagram) і на вэб-сайтах Музея ў рэкламных мэтах Музея або/і  ў сувязі з выкананнем статутных абавязкаў, г.зн. садзейнічанне і ажыццяўленне артыстычнай дзейнасці і папулярызацыі культуры.

11. Забараняюцца любыя непрыстойныя паводзіны, выкарыстанне прыніжальнай лексікі, абвяшчэнне і вывешванне лозунгаў непрыстойнага, вульгарнага, расісцкага ці іншага зместу, якія парушаюць або могуць парушаць асабістыя правы і агульнапрынятыя законы, заклікі да нацыянальных, рэлігійных, сацыяльных канфліктаў, а таксама любыя паводзіны, якія супярэчаць сацыяльным і маральным нормам.

12. Забараняецца пашкоджанне, знішчэнне і крадзеж прадметаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі правядзення мерапрыемства.

13. Службы парадку Арганізатара і гарадскія праваахоўныя органы маюць права выдаліць з тэрыторыі мерапрыемства парушальнікаў палажэнняў Рэгламенту або прыняць іншыя адпаведныя меры, накіраваныя на спыненне парушэння палажэнняў Рэгламенту.

14. Тэрыторыя мерапрыемства пастаянна кантралюецца. У выпадку выяўлення небяспекі людзі, якія прымаюць удзел у падзеі, павінны:

a) неадкладна паведаміць праваахоўныым або інфармацыйным службы пра пагрозу:

Ахова Музея 22 471 03 25

Цэнтр аварыйнай абвесткі 112

Гарадская служба 986

SMS-паведамленне 723 986 112

Паліцыя 997

Пажарная служба 998

Хуткая дапамога 999

b) выконваць інфармацыйныя загады, атрыманыя ад службаў парадку і інфармацыі

c) не перашкаджаць праезду ратавальных службаў.

15. Рэгламент удзелу ў мерапрыемстве даступны да азнаямлення на сайце www.polin.pl, а таксама ў інфапунце на тэрыторыі правядзення мерапрыемства. Арганізатар пакідае за сабой права ўносіць змены ў Рэгламент.